Ораторское мастерство. Умение заинтересовать большинство, привлечь внимание лишь словом, а не поведением, высказаться на публику без дрожащего голоса с правильной жестикуляцией – все это является существенным качеством для дипломата.

Выдвижение личной инициативы, нахождение компромисса способствуют улучшению исхода переговоров. В этом дипломатическому служащему могут помочь такие качества, как решительность, умение договариваться, находчивость, а также креативность. Ведь именно она может помочь прийти к различным нестандартным решениям путем предложения инновационных идей.

Также следует обратить внимание на то, что настоящему дипломату стоит обладать навыком нахождения подходов к людям. Государственный служащий систематически встречается с представителями различных национальностей, религий и культур. Каждому из них нужно уделять особое внимание, учитывая особенности их менталитета. Дипломат должен быть толерантным, эмпатичным, знать элементарные азы психологии, чтобы иметь возможность избегать неловких пауз, трудностей в период общения с участниками переговоров.

Чаще всего люди не углубляются в то, насколько много подводных камней в данной профессии. Дипломатическая служба – это профессия, которая, с одной стороны, состоит из уникального опыта и многообразия аспектов, затрагивающих всевозможные сферы жизни общества, а с другой – это морально сложная работа не только на благо своего государства, но и над собой.

**Литература**

1. Попов, В. И. Современная дипломатия. Теория и практика : Курс лекций. Ч. 1: Дипломатия – наука и искусство / В. Попов // ДА МИД РФ. – М. : Научная книга, 2000. – 20 с.

# Развіццё сістэмы водазабеспячэння гарадоў БССР у перыяд НЭПа (1921–1928)

*Пецюкевіч Т. У., асп. БДУ,*
*навук. кір. Паддубская А. Ф., канд. гіст. навук, дац.*

Сістэма водазабеспячэння гарадоў з’яўляецца важным элементам камунальнай гаспадаркі, стан функцыянавання якога аказвае значны ўплыў на санітарны стан горада і паўсядзённае жыццё гарадскога насельніцтва.

Крыніцамі водазабеспячэння гарадоў БССР у перыяд НЭПа былі вадаправод, калодзежы і прыродныя вадаёмы. Цэнтральнае водазабеспячэнне функцыянавала ў Мінску, Віцебску, Мазыры, Гомелі і Магілёве. Вадаправодам забяспечвалася ў сярэднім да 70% насельніцтва [1, с. 122].

Варта адзначыць, што ў перыяд войн і рэвалюцый вадаправодныя сістэмы гарадоў, як і камунальная гаспадарка ў цэлым, панеслі страты, у выніку чаго прадпрыемствы мелі патрэбу ў аднаўленні і рамонце. Эксплуатацыяй на месцах займаліся камунальныя аддзелы гарадскіх саветаў, а пасля 1924 г. – камунаддзелы акруговых выканкамаў.

Якасць водазабеспячэння вызначалася крыніцамі водазабора. Віцебскі вадаправод сілкавалі 3 артэзіянскія студні, якія знаходзіліся на беразе р. Сутокі пры ўпадані яе ў Заходнюю Дзвіну. Ачыстка вады не праводзілася, а яе падача была электрыфікавана: для перакачкі выкарыстоўваліся цэнтрабежныя насосы [2, л. 224 зв.]. У Магілёве вада падавалася паравымі насосамі непасрэдна ў сетку, а вадазабор ажыццяўляўся з 2 артэзіянскіх калодзежаў [2, л. 227 зв.]. Мазырскі вадаправод забяспечваўся вадой з прыроднага вадаёма – ракі Прыпяць. Крыніцамі водазабеспячэння сталічнага вадаправода былі 5 бруклінскіх калодзежаў і артэзіянскія свідравіны, колькасць якіх на працягу разглядаемага перыяду была даведзена на 3 [3, л. 5]. Варта адзначыць, што артэзіянская вада з'яўлялася найбольш якаснай па прычыне яе падачы з больш глыбокіх пластоў грунта.

Вадаправод забяспечваў пераважна цэнтральную частку гарадоў, насельніцтва астатніх раёнаў і гарадоў без цэнтральнага водазабеспячэння карысталася вадой са студняў і вадаёмаў. Так, 75% насельніцтва Магілёва спажывала ваду са 139 калодзежаў, якасць вады якіх характарызавалася як «падазроная». Сярод 56 калодзежаў Воршы, якія былі даследаваны санітарнымі ўрачамі, працэнт студняў з вадой «задавальняючай» якасці склаў 85 [4, с. 82]. Каля 90% насельніцтва Полацка карысталася рачной вадой з Палаты і Заходняй Дзвіны, якая ў гарадской рысе мела высокую ступень забруджанасці. Гэта акалічнасць была адной з прычынаў штогадовых выбухаў страўнікава-кішачных інфекцый, якія ў 1925 і 1928 гг. дасягнулі памераў буйных эпідэмій [5, с. 45].

На працягу разглядаемага перыяду гарадскімі ўладамі ажыццяўляўся шэраг мерапрыемстваў па мадэрнізацыі вадаправодаў, пашырэнні сеткі і колькасці крыніц водазабора. Увага надавалася таксама пытанню кантралявання якасці вады. Так, у 1926 г. на мінскай электрычна-вадаправоднай станцыі былі ўведзены сістэматычныя хімічныя аналізы вады праз Пастэраўскі інстытут [3, л. 4 зв.]. Дзеля грунтоўнага вырашэння праблемы водазабеспячэння сталіцы ў 1928 г. была заключана дамова на правядзенне комплекснага гідралагічнага даследавання ў межах горада з Бюро па вывучэнню падземных водаў СССР. Распрацоўкай канчатковага праекта займалася дзяржбюро «Няптун» [6, л. 50 зв.]. У 1927–1928 гг. пачынаюць распрацоўвацца праекты вадаправодаў для такіх буйных акруговых гарадоў, як Орша і Бабруйск.

Такім чынам, у перыяд НЭПа прадпрыемствы водазабеспячэння знаходзіліся ў вядзенні мясцовых камунальных аддзелаў і ў сваёй аснове заставаліся

некамерцыйнымі структурамі. Моцнасці гарадскіх вадаправодаў было недастаткова для поўнага забеспячэння патрэбаў гарадоў. Асноўнай праблемай, якая тармазіла развіццё прадпрыемстваў, быў недахоп абаротных сродкаў. Галоўную мэту тарыфнай палітыцы разглядаемага перыяду – падняцце тарыфаў на камунальныя паслугі да ўзроўня сабекошту з мэтай бездыфіцытнай працы камунальнай гаспадаркі – аказалася цяжка рэалізаваць на практыцы па прычыне нізкай плацежаздольнасці насельніцтва і неабходнасці захавання класавага падыходу. Дзеля паляпшэння сітуацыі з фінансамі пасля 1926 г. вадаправоды разам з другімі адзінкамі мясцовай гаспадаркі былі аб'яднаны ў акруговыя трэсты камунальных прадпрыемстваў. Прадпрыемствы трэста ўтваралі асобую гаспадарчую адзінку з правамі юрыдычнай асобы, што адчыняла больш магчымасцяў для крэдытавання [7, л. 65].

**Літаратура**

1. Абраменко, М. Е. Очерки истории здравоохранения Беларуси, 1917–1945 гг. : монография / М. Е. Абраменко. – Гомель : ГомГМУ, 2013. – 240 с.
2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 691. – Воп. 1. – Спр. 61.
3. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 7. – Воп. 1. – Спр. 598.
4. Ведерников, П. М. К вопросу о водоснабжении и канализации в окружных городах БССР / П. М. Ведерников // Беларуская мэдычная думка: часопіс / рэдкал.: М. І. Барсукоў [і інш.]. – Менск : Нар. камісарыят аховы здароўя БССР. – 1926. – Т. 2. – №12–13. – С. 81–88.
5. Трашчэўскі, Н. П. Да пытання аб піцьцёвых крыніцах гораду Полацку / Н. П. Трашчэўскі, В. П. Родкін // Беларуская мэдычная думка : часопіс / рэдкал.: М. І. Барсукоў [і інш.]. – Менск : Нар. камісарыят аховы здароўя БССР. – 1929. – №2–4. – С. 44–54.
6. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 31. – Воп. 1. – Спр. 137.
7. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 691. – Воп. 1. – Спр. 88.

## Особенности геополитического положения Макао

*Пранович Е. В., студ. I к. БГУ,*
*науч. рук. ст. преп. Чувилов И. А.*

Макао, или же Аомынь (согласно транскрипционной системе Палладия – Аомэнь), включает в себя полуостров Макао, острова Тайпа и Колоан. Оба острова соединены с Аомынь дорогой и двумя мостами. Сам Макао связан с материковой частью Китая через узкий перешеек в точке, именуемой Портас-ду-Серко, или же Барьерные ворота, служащие своеобразной границей между Макао и Китаем [1, с. 1].